**КААРДЫНАЦЫЯ** -- (лац. *co(n)* ‘разам’ і *ordination* ‘размяшчэнне па парадку’) фармальнае ўзаемнае падпарадкаванне дзейніка і выказніка.

Формы роду і ліку выказніка залежаць ад выражэння дзейніка і ад яго дадатковых семантычных адценняў.

Пры каардынацыі дзейніка і выказніка трэба ўлічваць наступныя правілы:

выказнік мае форму ***толькі множнага ліку***, калі дзейнік выражаны:

1) колькасна-іменным спалучэннем, у складзе якога ёсць азначэнні або словы *ўсе, гэтыя* (*дзве дзявочыя постаці, усе тры дзяўчыны, гэтыя два хлопцы* і пад.): *Раптам за ракою загарэліся тры сінія ракеты* (М. Лупсякоў); *Гэтыя два пакойчыкі цалкам былі застаўлены сталамі*; *Усе тры дзяўчыны ўсміхаліся*; *Дзве дзявочыя постаці мільганулі на фоне лугавой зеляніны* (Т. Хадкевіч);
2) спалучэннем назоўніка (займенніка) у форме Н. с. і назоўніка ў форме Т. с. з прыназоўнікам *з* (*дзед з бабуляю, маці з дзецьмі, я з сябрам* і пад.): *Мы з Пятровічам хадзілі ад сасны да сасны, на кожнай грэючы далоні, вочы, душы* (В. Карамазаў); *Сцепаніда з Петраком па старадаўнім звычаі пайшлі ў хлеў* (В. Быкаў); *Як толькі ў песню ўліліся Пятрусь з Віктарам, стала ясна, што нікому далучацца да песні не трэба* (Я. Скрыган);

выказнік мае форму ***толькі адзіночнага ліку***, калі дзейнік выражаны:

1) колькасна-іменным спалучэннем са словамі *ўсяго, толькі* (*усяго два кіламетры, толькі трое студэнтаў* і пад.): *Да вёскі па лузе было ўсяго два кіламетры; На занятку з’явілася толькі трое вучняў*;
2) колькасна-іменным спалучэннем са словамі *мінут, хвілін, гадзін, дзён, тыдняў* і г. д.: *Мішу ў той год было толькі дзесяць гадоў* (А. Пальчэўскі); *На гэта ішло два-тры гады* (У. Арлоў); *Мінулі тыдні два, і я атрымаў газету, дзе была надрукавана цэлая паласа маіх вершаў* (Б. Сачанка);
3) спалучэннем назоўнікаў, адзін з якіх мае колькаснае значэнне (*двойка, пара, тройка, дзясятак, сотня* і пад.): *На яе* [*ракі*] *роўнядзі, як два апалыя лісты, плавала пара дзікіх качак* (І. Пташнікаў); *Сотня navaбранцаў маршыравала на плошчы*;
4) спалучэннем адмоўнага або няпэўнага займенніка з назоўнікам (займеннікам) ускоснага склону з прыназоўнікам *з*: *Нехта з вучоных лічыў, што, апрача сямі цудаў свету, яшчэ існавала сем цудаў вынаходніцтва: кола, рычаг, вінт, плаўка металу, пісьменнасць, ткацтва…* (А. Асіпенка); *Хтосьці з дзяцей пабег адчыніць; Ніхто з іх не ведаў, дзе вораг, колькі яго*;

выказнік, ***як правіла***, мае форму ***адзіночнага ліку***, калі дзейнік выражаны:

1) спалучэннем уласнаколькаснага або зборнага лічэбніка з назоўнікам (займеннікам) (*тры дні, двое вучняў* і пад.): *Да першага верасня заставалася тры дні* (У. Шахавец); *…Шасцёра іх стаяла купкай ля зламанага дышля шлагбаума* (В. Быкаў);
2) спалучэннем назоўніка няпэўна-колькаснага значэння з назоўнікам роднага склону множнага ліку (*група партызан, большасць студэнтаў, частка вучняў* і пад.): *Група партызан… пабывала ў сувязнога…* (І. Сіняўскі); *Большасць паўстанцаў рассеялася, разышлася па хатах* (В. Хомчанка);
3) спалучэннем няпэўна-колькасных слоў з назоўнікам (займеннікам) роднага склону множнага ліку (*шмат дзён, колькі хваляванняў, некалькі азёр* і пад.): *Колькі хваляванняў было тут у кожнага* (А. Пальчэўскі); *На гэтыя трывожныя крыкі зляцелася шмат сініц…* (З. Бяспалы); *Пасажыраў у вагоне было няшмат* (М. Дубоўскі); *На гумне стаяла многа калод пчол* (З. Бядуля);

выказнікі ***могуць мець форму множнага ліку*** пры дзейніках са значэннем асобы, а таксама ў тых выпадках, калі падкрэсліваецца актыўнасць дзеяння: *Тут раслі,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*нахіліўшыся, некалькі алешын* (К. Кірэенка). *Некалькі чалавек запальвалі шнуры…* (І. Мележ).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ